## *Аб тым, што хвалюе*

# ПРА НАША ЖЫЦЦЁ

Жыццё складаецца з барацьбы і вырашэння разнастайных супярэчнасцей. Палосы ўдач і няўдач, шчасця і бед размяркоўваюцца ў ім пачаргова. Таму бачыць яго трэба як чорна-белую зебру. Той, хто гэта ведае, адносіцца спакойна да чаргавання ўдач і няўдач, ён разумее, што гэта натуральнае цячэнне чалавечага жыцця, і не ўпадае ў паніку хаця б пры невялікай бядзе або няўдачы. Ад такога разумення залежыць многае. Для аднаго дрэнныя абставіны — гэта падстава для самаізаляцыі, для суму і адчаю, для іншага — імкненне пераўзыйсці, пераадолець няшчасці.

Сама прырода запраграміравала нас так, што мы павінны пастаянна пераадольваць цяжкасці. Няма цяжкасцей, наступае дэградацыя асобы. Як абавязаны мы бесперапынна трэніраваць сваю мускулатуру або ўнутраныя органы, інакш яны зачахнуць ад дысфункцыі, так павінны мы ўвесь час трэніраваць і сваю волю пераадольваннем цяжкасцей, перагрузкамі і пастаноўкай усё больш складаных задач. Калі няма будняў, мы перастаем разумець, што такое святы. Калі няма непрыемнасцей, мы адвучваемся разумець, што такое прыемнае.

Ні ў якім разе не трэба штучна ствараць сабе цяжкія абставіны, іх будзе дастаткова і без таго, а трэба зразумець, што наяўнасць цяжкасцей — справа натуральная, і, наадварот, калі іх доўгі час чамусьці няма, то мы абавязаны гэтым сур'ёзна занепакоіцца. Лёгка жыць нельга!

...Наша жыццё далёка не суцэльны пераможны марш пад фанфары. Той, хто лічыць, што яно павінна складацца з адных свят, хутка расчаруецца ў ім і прыйдзе да думкі, глыбока памылковай думкі, што жыццё дрэннае. А яно добрае і можа быць яшчэ лепшым, але толькі за гэта трэба змагацца, разумна змагацца, а не ўпадаць у адчай або ў цынізм, пераходзіць на пазіцыю тых, для каго каралём жыцця з'яўляюцца радасці на ўзроўні пратаплазмы.

**(З кнігі Ю. Андрэева «Шчырая размова).**

# ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК

### ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ?..

...што жыццё ў нас становіцца ўсё больш даражэйшым таму, што не з'яўляецца прадметам першай неабходнасці?

* * *

...мы народжаны, каб зрабіць явай нават самыя страшныя казкі?

* * *

...пры сацыялізме ўзнікла новая гістарычная супольнасць людзей — чарга?

### ПАРАДЫ Ў ЧАС СЕСІІ

На прапанову экзаменатара: «Бярыце білет» адказвайце, што аддаеце перавагу білетам латарэі «Спрынт».

* * *

На папрок экзаменатара, што ён бачыць вас упершыню, адказвайце: «Я не вінаваты, што ўвесь семестр вы былі такія няўважлівыя».

* * *

Няхай выкладчык не шукае з вамі сустрэчы — спатрэбіцца, вы самі яго знойдзеце.

### КАЛЕЙДАСКОП

Работа — задавальненне, якое не трэба расцягваць.

* * *

Спаборніцтвам ахапілі ўсіх, але не ўсіх паставілі аб гэтым у вядомасць.

* * *

Пустая фармальнасць, а колькі даведак запатрабавала!!!

* * *

Ад вялікага да смешнага — адзін крок, а ад адказнасці да безадказнасці — усяго тры літары.

* * *

Вынікі гаварылі самі за сябе, але гаварылі не тое, што хацелася б.

### УРЫЎКІ З НЕНАПІСАНАГА

Душа яго так часта ўходзіла ў пяткі, што яны сталі натхнёнымі.

* * *

Быў да таго светлай асобай, што на яго хацелася надзець абажур.

* * *

Чалавек з пастаянным адрасам: яго хата заўсёды з краю.

* * *

Сёння ён падлізваўся да таго, каго лаяў учора, — ён не любіў паўтарацца.

**(Па старонках вузаўскіх шматтыражных газет).**

*Інтэрв'ю па просьбе чытачоў*

# Вывесці радыёнукліды? Можна!

«Скажыце, як рацыянальна харчавацца ва ўмовах забруджанай мясцовасці, каб зменшыць накапленне радыяцыі? Што садзейнічае паскоранаму вывядзенню радыёнуклідаў, змяншае іх засваенне?» — з такімі пытаннямі звяртаюцца ў рэдакцыю.

Наш карэспандэнт звязаўся па тэлефоне з кіраўніком прэс-цэнтра навукова-даследчага інстытута радыяцыйнай медыцыны МЗ БССР Анатолем Мікалаевічам Худакормавым. Вось яго адказ:

— Ва ўмовах забруджанай радыёнуклідамі мясцовасці харчавацца неабходна толькі чыстымі прадуктамі. Усе спажываемыя прадукты, рэалізуемыя праз гандлёвую сетку і на калгасных рынках, праходзяць абавязковы дазіметрычны кантроль. Асабліва старанна трэба правяраць прадукты з асабістых падсобных гаспадарак і прадукты, якія нарыхтоўваюцца насельніцтвам. Гэта датычыць малака, мяса, садавіны, агародніны і ягад, якія вырастаюць на забалочаных мясцовасцях (чарніцы, галубіцы, журавіны і г. д.), а таксама грыбоў усіх відаў.

У Беларусі ёсць рад раёнаў, дзе збор грыбоў забаронены, або дазволены часткова, але з абавязковым дазіметрычным кантролем.

Вельмі важны выбар правільнага рацыёну харчавання і захоўвання санітарна-гігіенічных норм у адносінах да харчовых прадуктаў. Харчаванне павінна быць разнастайным і збалансаваным. Вельмі важна харчавацца прадуктамі з высокім утрыманнем бялку і вітамінаў В, С, Е. У сувязі з гэтым неабходна спажываць дастатковую колькасць мяса і марской рыбы. Акрамя таго, карысныя марская капуста, кальмары.

У арганізм для вывядзення радыёнуклідаў добра ўводзіць метыянін. Ён паступае ў арганізм з сырам, малочна-кіслымі прадуктамі, мясам, рыбай і яйкамі. Акрамя таго, малако і яйкі багатыя кальцыем, які садзейнічае змяншэнню накаплення радыёстронцыю ў арганізме. Наяўнасць калію (буракі, курага, урук, арэхі) зніжае накапленне цэзію-137. Крыніцай вітаміна С з'яўляюцца шыпшына, абляпіха, чорныя парэчкі, пятрушка, чырвоны салодкі перац.

Вітамінам Е багатыя раслінныя маслы (алей, кукурузнае, канаплянае, льнянное), а таксама пячонка, зялёны гарошак, арэхі. Вітамін В утрымліваецца ў мясе, асабліва ў пячонцы, малацэ, тварагу, драждҗах, хлебе, грэчцы, чаі, садавіне і гародніне.

Добра прымаць полівітаміны «Рэвіт», «Ундэвіт», «Дэкамевіт». Неабходна ўводзіць у рацыён харчавання сокі: грушавы, абрыкосавы, яблычны, персікавы, апельсінавы. А таксама слівы, агрэст, маліну, вішні, чарэшню, журавіны, вінаград.

Для зніжэння часу знаходжання радыёнуклідаў у кішэчна-страўнікавым тракце неабходна ўключаць у рацыён бялкова-вотруб'евы хлеб, ячневую крупу, проса, чырвоныя і чорныя парэчкі, яблыкі, грушы.

Усю гародніну і садавіну перад ужываннем трэба вымыць у чыстай працечнай вадзе.

*Байцам студэнцкіх атрадаў*

# Каб пазбегнуць захворванняў і траўм

Байцам студэнцкіх будаўнічых атрадаў у асноўным даводзіцца працаваць пад адкрытым небам, пад сонечнымі промнямі. Вядома, што сонца садзейнічае павышэнню ўстойлівасці арганізма да многіх неспрыяльных фактараў знешняга асяроддзя. Гэта добра адбіваецца на працаздольнасці і настроі чалавека. Але трэба заўсёды памятаць, што станоўча ўплываюць на арганізм толькі ўмераныя дозы сонечнай радыяцыі.

Што адбываецца пры пераграванні арганізма? У спёку ўключаюцца механізмы рэгуляцыі тэмпературы цела. У чалавека ўзмацняецца потааддзяленне, пачашчаецца дыханне, з'яўляецца смага, чырванее скура. Пры такіх прыкметах трэба перайсці ў цень. Калі гэтага не зрабіць, арганізм будзе страчваць вадкасць за кошт потааддзялення, што выкліча недастатковасць кровазвароту мозгу і сэрца. Таму пры цеплавым удары наступае галаўны боль, сэрцабіенне, задышка. У гэтым выпадку пацярпеўшага трэба перанесці ў цень, пакласці на спіну, прыўзняць ногі, паклаўшы што-небудзь пад калені, расшпіліць гузікі на адзенні. На галаву трэба пакласці ручнік, змочаны халоднай вадой. Можна даць яму выпіць халоднага чаю, пры моцным галаўным болі — таблетку анальгіна або амідапірына. Пры страце прытомнасці змачыце ватку нашатырным спіртам і патрымайце яе на невялікай адлегласці ад носа пацярпеўшага. Калі на целе з'явяцца сонечныя апёкі, іх неабходна змазаць вазелінам або алеем.

**Памятайце аб прафілактыцы страўнікава-кішэчных інфекцый.**

Строга захоўвайце правілы прафілактыкі вострых кішэчных захворванняў — дызентэрыі харчовых атручванняў, халеры. Гэтыя правілы вельмі простыя: мыйце гародніну і фрукты кіпячонай вадой, рукі перад ядой з мылам, захоўвайце ўсе прадукты, жыллё ад мух і знішчайце іх, трымайце ў належным парадку харчаблок атрада, ужывайце ваду і малако толькі ў кіпячоным выглядзе. Пры выяўленні хворага з падазрэннем на страўнікава-кішэчнае захворванне тэрмінова адпраўляйце яго на лячэнне да ўрача.

**Аб траўмах і крывацёках**

Калі з чалавекам здарылася няшчасце і ён атрымаў траўму, неабходна аказаць яму даўрачэбную дапамогу. Пры пераломе канечнасці забяспечце ёй нерухомасць з дапамогай спецыяльнай шыны або падручных сродкаў — картону, палкі, галіны дрэва і г. д. Для гэтага шына прыкладваецца да пашкоджанай канечнасці (спачатку неабходна абкласці яе ватай або мяккай пракладкай) так, каб захапіць не менш двух суставаў і прыбінтаваць канечнасць да шыны. У такім стане хворага можна транспарціраваць у бальніцу.

Пры крывацёках галоўнае месца адводзіцца аказанню першай дапамогі на месцы здарэння. Трэба спыніць крывацёк з дапамогай жгутоў, бінтоў, падручных сродкаў. Умець карыстацца імі абавязаны кожны. Спыненне крывацёку з дапамогай ціснучай павязкі — найбольш просты і даступны спосаб. Пажадана выкарыстоўваць перавязачны пакет або стэрыльны бінт, у крайнім выпадку кавалак любой тканіны.

Калі для спынення крывацёку накладваецца жгут, то знаходзіцца ён на пашкоджанай канечнасці павінен не больш дзвюх гадзін, інакш канечнасць можа амярцвець.

Пацярпеўшага неабходна ў абавязковым парадку як мага хутчэй даставіць у бальніцу.

Спадзяёмся, што ўсе нашы парады дапамогуць вам пазбегнуць захворванняў, траўм у час працоўнага семестра.

**С. ПІМАШЭНКА,**
**загадчык сектара медпадрыхтоўкі і ТБ абласнога штаба студэнцкіх атрадаў.**



НА БЛАКІТНАЙ МАГІСТРАЛІ СОЖА.

## СПОРТ

# Першыя сярод ВНУ

Сёлета была праведзена абласная спартакіяда навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і студэнтаў ВНУ па 8 відах спорту. У ёй прынялі ўдзел 18 сярэдніх спецыяльных і 5 вышэйшых навучальных устаноў. У залік спартакіяды ішлі 6 лепшых вынікаў па відах спорту.

Прэзідыум Гомельскага абласнога савета УДФСТ прафсаюзаў падвёў вынікі абласной спартакіяды і прыняў адпаведную пастанову.

Па групе ВНУ першае месца заваяваў наш універсітэт (старшыня спартклуба Д. М. Жаркоў, загадчык кафедры фізвыхавання В. А. Каляда). Наша каманда набрала 156 ачкоў, на 7 ачкоў апярэдзіўшы мінулагодніх пераможцаў спартакіяды — спартсменаў БІІЧТа. Нашы студэнты аказаліся мацнейшымі ў настольным тэнісе, валейболе, баскетболе, міні-футболе, летнім комплексе ГПА, лёгкаатлетычным кросе, і гэтага хапіла, каб стаць недасягальнымі ў турнірнай табліцы.

З поспехам нашых спартсменаў і іх трэнераў цёпла павіншаваў прарэктар па вучэбнай рабоце М. В. Селькін.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзярж. камітэта БССР па друку. Гомель, Савецкая, 1.

Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 2000 экз. Заказ 334.